таго формамі і жанрамі паліфаніі дазволіць глыбей пранікнуць у стылістычныя асаблівасці твораў розных эпох. Практыка паказвае, што на старэйшых курсах для харавых спецыялізацый неабходна ўвесці спецкурс па практычнай паліфаніі, які даў бы веды студэнтам па выкарыстанні прыёмаў асабліва падгалосачнай паліфаніі пры аналізе і апрацоўцы народных песень і харавых твораў.

Вельмі неабходны новы падыход да выкладання аналізу музычных твораў. Гэта адна з самых складаных музычна-тэарэтычных дысцыплін, якая патрабуе для яе засваення глыбокіх ведаў па тэорыі музыкі, гармоніі і паліфаніі. У працэсе выкладання гэтай дысцыпліны распрацавана методыка, згодна з якой студэнт мае магчымасць авалодаць сродкамі выразнасці музыкі і асноўнымі формамі музычных твораў, якія склаліся на працягу развіцця музычнага мастацтва. Але ж сёння з улікам новых падыходаў да падрыхтоўкі студэнта рамкі гэтай дысцыпліны патрэбна пашырыць. У шэрагу музычных устаноў свету музычны аналіз з'яўляецца па сутнасці не самастойнай тэарэтычнай дысцыплінай, а своеасаблівым сінтэзам, надстройкай класічных тэорый (форм, гармоніі, паліфаніі і г.д.). У педагагічным працэсе музычны аналіз - асноўная частка музычнага выхавання ў ВНУ першаступеннай цяжкасці, яго складанасць і комплекснасць патрабуюць глыбокіх ведаў па многіх дысцыплінах. Неабходна адрозніваць дзейсны аналіз і аналіз формы твора, які часцей застаецца на ўзроўні статыстычнага ўліку таго, што ў партытуры. Таму на вышэйшай ступені падрыхтоўкі неабходна, каб аналіз стаў эстэтычным, зацікаўленым, актыўным, каб у працэсе яго твор не ўспрымаўся як сам сабою зразумелы мастацкі прадукт. Метады аналізу павінны стаць шматграннымі, візуальны аналіз партытуры -- звязаны са слыхавым успрыманнем і назіраннем гукавой формы твора.

У выніку стварэння шматузроўневага падыходу да выкладання музычна-тэарэтычных дысцыплін з'явіцца магчымасць лагічна аб'яднаць не толькі дысцыпліны, але ж і стварыць умовы для музычнай падрыхтоўкі студэнтаў на сучасным узроўні.

**Галіцкая Н.П.,**
**выкладчык**

## СПЕЦЫФІКА ВЫКАРЫСТАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ НА ЗАНЯТКАХ САЛЬФЕДЖЫО ВА ЎМОВАХ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Універсітэцкая адукацыя патрабуе новай, больш якаснай методыкі ў справе падрыхтоўкі студэнтаў нашай навучальнай установай. У сувязі з гэтым паглыбленае выкарыстанне нацыянальнага фальклору ў курсе сальфеджыо, бясспрэчна, будзе спрыяць развіццю як музычнага мыслення і густу, так і творчых здольнасцей будучых дзеячаў беларускай культуры.

Пры звяртанні да песеннага фальклору на занятках неабходна настойліва выпрацоўваць у студэнта здольнасць падыходзіць да музычных прыкладаў як да мастацкіх узораў з пэўным мастацкім зместам.

У выкарыстанні народных песень адным з важнейшых момантаў з'яўляюцца сродкі музычнай выразнасці: дынамічныя адценні і іншыя прыкметы музычнай нюансіроўкі, а таксама строга вытрыманы тэмп і інш. Работу над народна-песенным матэрыялам лепш праводзіць на двух узроўнях: з аднаго боку - чытка з ліста, з другога - руплівая адпрацоўка ў найбольш складаных нумарах усіх мелодыка-рытмічных цяжкасцей, імкненне да высокатворчага выканання. Пры гэтым трэба памятаць, што народнапесенны рытм мае сваю асаблівую спецыфіку і што рытмічная структура народных песень цесна звязана з вершаваным зместам.

З народных напеваў для добрага ўспрымання напачатку лепш выкарыстоўваць танцавальныя, гульнявыя песні як найбольш простыя. Яны маюць больш знаёмую для слыху перыядычную акцэнтную рытміку. Для большасці традыцыйных песень --вясельных, лірычных і інш. -- тыповым з'яўляецца пераменны метрарытм. У такіх напевах тактавая рыска размяжоўвае не цяжкую долю ў такце, а заканчэнне вершаванай страфы. Памеры пры гэтым часцей за ўсё пяцідольнікі, сямідольнікі, а таксама пераменныя.

Народнапесенная мелодыка патрабуе іншага падыходу да тлумачэння ладу, а таксама іншай тэхнікі інтанавання гукараду. Трэба настойліва дамагацца дакладнага, чыстага інтанавання на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роднапесенных узораў, спяванне якіх неабходна абавязкова суправаджаць дырыжыраваннем (з мэтай развіцця метрарытмічнай дасканаласці выканання). Вельмі карысна ўводзіць у заняткі мелодыі як для завучвання на памяць, так і для падбору за інструментам, транспанавання іх ў іншыя танальнасці.

У наш час у музычным асяроддзі назіраецца новы ўздым цікавасці да песеннага фальклору. Усебаковае вывучэнне беларускага народнага меласу ў курсе сальфеджыо дапаможа студэнтам - будучым выкладчыкам і кіраўнікам мастацкіх калектываў -- больш грунтоўна пранікнуць у тыповыя асаблівасці народнапесеннай творчасці. Гэта з'яўляецца неабходным і вельмі актуальным у новых умовах шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларускім універсітэце культуры.

Зяневіч У.К.,
ст.выкладчык

## РЭФОРМА ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСІ Ў 90-Я ГАДЫ XX ст.

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, нацыянальна-культурнае адраджэнне на Беларусі маюць сваёй перадумовай абуджэнне і рост нацыянальнай самасвядомасці. Фальклор і родная мова - гэта найважнейшыя элементы ў сістэме нацыянальнай мастацкай культуры, якія надаюць дадзенай культуры яе нацыянальную адметнасць. Яны рэгенерыруюць увесь час нацыянальна-характэрнае ў ёй, з'яўляюцца моцным фактарам росту нацыянальнай самасвядомасці.

Але ж і ўмацаванне Беларусі ў якасці незалежнай дзяржавы, працэс беларусізацыі грамадска-палітычнага жыцця (што, натуральна, мусіць стаць адным з аспектаў палітыкі суверэннай дзяржавы) у сваю чаргу спрыяюць росту самасвядомасці, абуджаюць цікавасць да вышэйшых праяў нацыянальнага духу беларусаў.

Усё гэта вымагае новых падыходаў, у тым ліку і ў пытанні аб рэфармаванні вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва. Галоўным пунктам у гэтай рэформе павінна стаць нацыяналізацыя вышэйшай школы, стварэнне нацыянальных праграм шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў гуманітарнага профілю. Такая нацыяналізацыя не павінна разумецца спрошчана, як пэўная інтраспекцыя, якая пакідае па-за ўвагай увесь пазітыўны сусветны вопыт у галіне адукацыі. Наадварот, працэс нацыянальнага самапазнання дазволіць нам глыбей адчуць агульнакультурны кантэкст, дакладна вызначыць і заняць сваё пачэснае месца ў сістэме сучаснай беларускай культуры.

Наспеў час удакладніць прыярытэты і выйсці на новы ўзровень патрабаванняў да якасці падрыхтоўкі студэнтаў спецыялізацыі "кіраўнік народнага хору". Пераход да шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі ва ўмовах Беларускага універсітэта культуры дазваляе пераадолець вельмі нерэнтабельную справу падрыхтоўкі вузка арыентаванага спецыяліста - хармайстра, кіраўніка народнага хору альбо фальклорнага гурта. Сёння кожны выпускнік азначанай спецыялізацыі павінен, на наш погляд, набыць дадаткова новыя якасці навукоўца, даследчыка нацыянальнай мастацкай спадчыны, які добра засвоіў як тэарэтычны, так і практычны аспекты сучаснага культурнага працэсу. Ён павінен быць здольным да вырашэння актуальных праблем практычнай фалькларыстыкі. Сучасны спецыяліст-выхаванец Беларускага універсітэта культуры - гэта культуролаг-практык, які ставіць сабе за мэту захаваць, зберагчы аўтэнтычны фальклор - аб'екты-візаваную здольнасць народа да мастацкай творчасці, ствараць спрыяльныя ўмовы для гарманічнага існавання і арганічнага развіцця ў сучасных умовах усяго багацця традыцыйнай народнай культуры.

У адпаведнасці з гэтымі прыярытэтамі трэба вызначыць асноўныя і факультатыўныя курсы навучання, склад і ўвесці ў дзеянне новыя, менавіта нацыянальныя праграмы падрыхтоўкі студэнтаў. Калі перафразаваць вядомы лозунг, можна сказаць, што адукацыя павінна стаць нацыянальнай па змесце і сучаснай па форме. Што маецца на ўвазе? Па-першае, неабходна грунтавацца на ўласных, распрацаваных беларускімі навукоўцамі, канцэпцыях нацыянальнай гісторыі і культуры, вызваленых ад напластаванняў вульгарызатарскага шалуціння і покрыва каланіяльнай залежнасці. Беларуская гісторыя і культура павінны вывучацца і даследавацца ў якасці унікальнай з'явы, самабытнага феномена, неабходнай часткі агульнага еўрапейскага працэсу. Па-другое, праграмы і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ